**Бушуева В.В.**, *ст.выкладчык*

# НАКІРУНКІ РАЗВІЦЦЯ ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ПАТОКАЎ І МАСІВАЎ БЕЛАРУСКАГА ЗАМЕЖЖА

Вывучэнне першасных дакументаль-ных патокаў і масіваў вялося намі з пункту гледжання іх відавога, геаграфічнага, моўнага напаўнення.

Дакументы, якія выходзілі і працягваюць выходзіць за мяжой, але датычацца Беларусі паводле іх формы ці зместу, - самыя разнастайныя.

Найбольш вялікі паток складаюць друкаваныя дакументы, але існуюць і распаўсюджваюцца таксама дакументы рукапісныя, машынапісныя і - у апошнія дзесяцігоддзі - аўдыёвізуальныя. Як вядома, друкаваныя дакументы па іх матэрыяльнай канструкцыі падзяляюцца на кнігі і перыядычныя выданні. Па мэтавым прызначэнні яны бываюць афіцыйнымі, навуковымі, навукова-папулярнымі, вучэбнымі, грамадска-палітычнымі, даведачнымі, літаратурна-мастацкімі. Найбольш вялікі па аб'ёму кніжны паток (пасля другой сусветнай вайны) выдаецца ў Амерыцы.

Беларускае кнігадрукаванне ў Амерыцы развівалася іншымі шляхамі, чым пасляваеннае беларускае кнігадрукаванне ў Заходняй Германіі. У Злучаных Штатах выдаваліся пераважна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратурныя і навуковыя працы, шматлікія мемуары, музычная, рэлігійная літаратура, а таксама падручнікі і інш.

Беларускае кнігадрукаванне ў ЗША было распачата рознымі арганізацыямі і прыватнымі асобамі, якія заснавалі свае выдавецкія прадпрыемствы. Гэта былі выданні Крывіцкага навуковага таварыства, Беларускага інстытута навукі і мастацтва, Злучанага беларуска-амерыканскага дапамогавага камітэта, рэлігійных установ, а таксама асобных людзей.

У кніжным дакументальным патоку найбольш значную колькасць складае мастацкая літаратура. Сустракаюцца моваінаўчыя і гістарычныя кнігі. Выяўлена таксама некалькі кніг па розных галінах ведаў.

Калі разглядаць кнігі па геаграфічнай прымеце, дык відавочна, што найбольшая іх колькасць выйшла ў ЗША, потым (па ўбываючай) у Германіі, Англіі, Францыі і Польшчы. Адзінкавыя выданні выходзілі ў Аргентыне, Італіі, Іспаніі. Калі браць пад увагу моўную прымету, то можна канстатаваць, што кніжныя дакументальныя патокі выходзяць на беларускай мове і прызначаюцца для беларусаў, якія там жывуць. Выдаюцца і англамоўныя кніжкі, пераважна інфармацыйнага характару.

Першыя беларускія перыядычныя выданні за мяжой з'явіліся яшчэ ў XVI ст. у Чэхіі. Але асноўная іх колькасць узнікла пасля другой сусветнай вайны. Вядомы такія перыядычныя выданні пачатку 50-х гадоў, як «Беларускі эмігрант», «Беларус», «Беларускі голас», «Конадні», «Беларашн Юс», «Беларуская моладзь» і інш.

Калі разгледзець іх па геаграфічнай прымеце, дык у 40-я гады найбольшая іх колькасць выйшла ў Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі, Вялікабрытаніі, Аўстраліі. З пачатку 50-х гадоў цэнтр перыядычнага друку перамяшчаецца на амерыканскі кантынент.

Часопісы, якія сёння выходзяць за мяжой, па тэматыцы падзяляюцца на грамадска-палітычныя, навуковыя, літаратурна-мастацкія, папулярныя, рэлігійныя. Са шматгаліновых прыкладамі могуць быць: «Беларускі свет» (ЗША), «Беларуская думка» (ЗША), «Веды» (ЗША). Галіновымі з'яўляюцца літаратурна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкі часопіс «Шыпшына» (Германія), навуковы часопіс «Запісы Беларускага інстытута навукі і мастацтва» (ЗША).

Амаль усе газеты беларускага замежжа універсальныя. На іх старонках публікуюцца звесткі грамадскага жыцця, навукі, літаратуры і мастацтва. Самымі вядомымі з іх на сённяшні дзень з'яўляюцца: «Беларус» (ЗША), «Голас Беларуса» (Канада), «Голас Варшавы» (Польшча).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ